# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

БДУ

11 лістапада 2004 года, чацвер, № 19 (1904)

## ЗВАРОТ ДА СТУДЭНТАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА РЭКТАРА БДУ ПРАФЕСАРА В.І. СТРАЖАВА

Дарагія студэнты!

Я звяртаюся да вас у сувязі з рэспубліканскім рэферэндумам і выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, што адбыліся 17 кастрычніка бягучага года.

Падобныя грамадска-палітычныя падзеі для кожнай дзяржавы з'яўляюцца асабліва значнымі. Бо толькі тая краіна можа называцца цывілізаванай, народ якой арганізаваны ў грамадзянскую супольнасць, дзе калі не кожны, то большасць разумее важнасць і каштоўнасць для сябе яго асноўных прынцыпаў. Удзел у такіх важных для дзяржавы падзеях выяўляе ўсведамленне чалавекам яго прыналежнасці да грамадства і каштоўнасці гэтага фактара для далейшага жыцця.

Сустракаючыся з вамі напярэдадні гэтых падзеяў у інтэрнатах і студэнцкіх аўдыторыях, пры асабістых размовах, выказваючы ўласную пазіцыю і погляды, мне хацелася, каб мы зразумелі адзін аднаго як члены адной супольнасці, як грамадзяне краіны, будучыня якой нам усім не абыякавая.

Вынікі галасавання вы ведаеце. Практычна ўсе студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах БДУ, прынялі ўдзел у рэферэндуме і выбарах. Я высока цаню гэта, бо ваш удзел быў усвядомленым. І яшчэ я бачу ў гэтым знак даверу і да мяне як да рэктара.

Ад імя кіраўніцтва універсітэта выказваю шчырую ўдзячнасць за праяўленую вамі грамадзянскую пазіцыю.

Карыстаючыся нагодай, віншую вас з Міжнародным днём студэнта! Гэтае свята ўжо стала ў БДУ традыцыйным і шанаваным. Зычу вам здароўя, удачы і поспехаў!

Толькі разам мы зробім наш універсітэт лепшым!

***Рэктар БДУ прафесар В.І. СТРАЖАЎ***

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Хімікі вярнуліся з дыпломамі

У Баку (Азербайджан) 27—30 кастрычніка прайшла міжнародная алімпіяда па хіміі сярод студэнтаў вядучых ВНУ краінаў СНД. Прысвячалася яна 250-годдзю Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М.В. Ламаносава.

У алімпіядзе ўзялі ўдзел 40 студэнтаў, якія прадстаўлялі 10 універсітэтаў Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў з Расіі, Украіны, Беларусі, Азербайджана, Грузіі, Казахстана, Узбекістана. Наш універсітэт быў прадстаўлены камандай хімічнага факультэта ў складзе кіраўніка каманды дацэнта хімфака В.М. Хвалюка, студэнта V курса Юрыя Галаўко і студэнта I курса Вячаслава Берната.

Па выніках алімпіяды Ю. Галаўко атрымаў дыплом I ступені, а В. Бернат — дыплом III ступені.

*Юлія ПЯТРОВА*

ВІНШУЕМ!

## Выйшлі ў паўфінал

На VII АСМ-спаборніцтвах каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў Заходняга чвэрцьфінальнага рэгіёну (Беларусь, Латвія, Эстонія, Літва і Калінінградская вобласць РФ) каманда нашага універсітэта заняла I месца.

Спаборніцтвы адбываліся 19—21 кастрычніка ў БДУ. У склад каманды-пераможцы ўвайшлі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Аляксей Данчанка і Аляксей Кіркоўскі. Другое месца занялі студэнты Тартускага універсітэта (Эстонія), трэцяе — Латвійскага універсітэта. У сёлетніх спаборніцтвах удзельнічалі 38 камандаў: 23 з Беларусі, 5 з Літвы, 3 з Латвіі, 4 з Эстоніі, 3 з Калінінграда.

Пераможцы атрымалі пуцёўку на паўфінал, які запланаваны ў Санкт-Пецярбургу (Расія) праз месяц пасля чвэрцьфінальных выступаў. Там выступяць 8 камандаў Заходняга рэгіёну, 3 з якіх будуць прадстаўляць БДУ (усе — з студэнтаў ФПМІ). Фінал студэнцкага чэмпіянату свету адбудзецца 3—7 красавіка 2005 г. у Шанхаі (Кітай).

*Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ*

## Найлепшыя студэнты-навукоўцы

У конкурсе навуковых работ студэнтаў БДУ вызначыліся пераможцы. У галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук перамагла работа студэнта V курса механіка-матэматычнага факультэта Кірылы Кузьміна "Устойлівасць вектарных камбінаторных задачаў дыскрэтнай аптымізацыі" (навуковы кіраўнік доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар У.А. Ямелічаў). У сферы сацыяльных і гуманітарных навук пераможцай стала работа выпускніцы філалагічнага факультэта Славяны Шамякінай "Змястоўна-фармальная адметнасць чарадзейнай казкі (на прыкладзе магічных рэчаў)" (навуковы кіраўнік кандыдат філалагічных навук Р.М. Кавалёва).

*Камісія*

ЮБІЛЕІ

## 100-годдзе з дня нараджэння рэктара БДУ П.П. Савіцкага

29 кастрычніка адбылося пасяджэнне Вучонага савета БДУ, прысвечанае 83-й гадавіне з дня заснавання універсітэта і 100-годдзю з дня нараджэння аднаго з рэктараў БДУ — Парфена Пятровіча Савіцкага. Менавіта ён стаяў на чале БДУ ў часы Вялікай Айчыннай вайны і падняў наш універсітэт на якасна новы ўзровень адукацыі.

Рэктар БДУ прафесар В.І. Стражаў прадставіў сваякоў П.П. Савіцкага, якія прыйшлі на святочнае пасяджэнне: жонку Лілію Савіцкую, сына — доктара біялагічных навук прафесара Барыса Савіцкага, дачку — члена Беларускага саюза кампазітараў Вольгу Савіцкую, зяця — мастацкага кіраўніка Беларускай філармоніі, Заслужанага артыста Беларусі, прафесара Беларускай акадэміі музыкі Юрыя Гільдзюка. На пасяджэнні выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце У.Л. Клюня з дакладам пра жыццё і дзейнасць П.П. Савіцкага.

Словы ўдзячнасці прадстаўнікам рэктарата выказала жонка рэктара Савіцкага Лілія Абрамаўна. Яна падзякавала за тое, што ў гэты дзень была аддадзена даніна памяці і пашаны дзейнасці Парфена Пятровіча. Да яе слоў далучыліся і астатнія члены сям'і рэктара Савіцкага. А дачка Савіцкая выказала асабістую падзяку У.Л. Клюні за даклад. В.Савіцкая адзначыла, што на ўрачыстым пасяджэнні пачула шмат новага пра свайго бацьку і ўбачыла, як на лёсе чалавека адбіваецца лёс краіны.

*Юлія ПАПОВА*

*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

***Ад рэдакцыі:*** *Пра жыццё і дзейнасць рэктара П.П. Савіцкага чытайце на 3-й стар.*



(Злева направа) У.Л. Клюня, В.П. Савіцкая, Ю.М. Гільдзюк, Л.А. Савіцкая, Б.П. Савіцкі

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# У кашальку студэнта

Якую стыпендыю атрымліваюць сённяшнія студэнты БДУ? З гэтым пытаннем карэспандэнт "Беларускага універсітэта" звярнуўся ў Галоўнае ўпраўленне планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў БДУ.

Згодна з дзеючым заканадаўствам, цяпер мінімальная стыпендыя ў БДУ складае 79.845 руб., імянная — 183.550 руб., а сацыяльная — 49.419 руб. Адзначым, што стыпендыі студэнтаў БДУ на 30% вышэй, чым стыпендыі ў іншых ВНУ. Так, мінімальная стыпендыя ў мінскіх ВНУ раўняецца 61.419 руб., імянная – 141.192 руб.

Цяперашняе павышэнне стыпендый у БДУ — самае істотнае ў параўнанні з аналагічнымі павышэннямі за мінулыя годы. У верасні 2003 года мінімальная стыпендыя ў БДУ складала 46.071 руб., у гэты ж час у 2002 годзе — 31.590 руб., а ў 2001 годзе — 19.793 руб.

Згодна з Інструкцыяй аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам ВНУ студэнты-гуманітарыі і студэнты-прыродазнаўцы за аднолькавыя балы атрымліваюць розныя стыпендыі. Хаця мінімальная стыпендыя для іх аднолькавая, максімальная для гуманітарыяў складае 119.768 руб., а для прыродазнаўцаў — 127.752 руб.

*Юлія ПАПОВА*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Візіт індыйскага міністра

Дзяржаўны міністр навукі і тэхналогій Індыі Капіл Сібал у рамках візіту ў Беларусь 2 лістапада наведаў Беларускі дзяржаўны універсітэт. У Беларусі замежны госць з дэлегацыяй індыйскіх навукоўцаў быў з 1 па 3 лістапада: прыняў удзел у пасяджэнні сумеснай беларуска-індыйскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій, наведаў Інстытут цепла- і масаабмену імя А.У. Лыкава НАН Беларусі.

У нашым універсітэце Капіл Сібал сустрэўся з рэктарам БДУ прафесарам В.І. Стражавым. Падчас сустрэчы рэктар пазнаёміў высокага госця з дасягненнямі універсітэта ў сферы навукі і тэхналогій, распрацоўкамі вузаўскіх навукоўцаў. Ішла гаворка і пра перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва. Візіт індыйскага міністра завяршыўся лекцыяй "Адносіны паміж дзяржаўнымі і недзяржаўнымі структурамі ў галіне развіцця і камерцыялізацыі тэхналогій" перад студэнтамі і выкладчыкамі БДУ.

*Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ*
*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*



СПОРТ

# Дні здароўя ў "Брыганціне"



*З 29 па 31 кастрычніка ў САК "Брыганціна" адбыліся спартыўныя спаборніцтвы "Дні здароўя", прысвечаныя дню заснавання нашага універсітэта.*

Арганізатарам мерапрыемства выступіў прафсаюзны камітэт супрацоўнікаў БДУ пры падтрымцы рэктарата універсітэта. Удзел у спаборніцтвах прынялі 275 чалавек з 12 факультэтаў і 10 падраздзяленняў БДУ — упершыню была прадстаўлена такая вялікая колькасць падраздзяленняў.

Адбыліся спаборніцтвы па міні-футболе (І месца — каманда студгарадка), баскетболе (І месца — факультэт радыёфізікі і электронікі), валейболе (І месца — ліцэй БДУ), настольным тэнісе (І месца сярод мужчын — супрацоўнік ФРФіЭ Дзмітрый Ушакоў, сярод жанчын — супрацоўніца гістфака Юлія Тагірава), плаванні (І месца сярод жанчын — супрацоўніцы кафедры фізвыхавання Кацярына Баранава і Валянціна Сеўба, сярод мужчын — прадстаўнік юркаледжа Андрэй Базылеў і супрацоўнік ФРФіЭ Генадзь Папко), шахматах (І месца сярод каманда — факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, у турніры сярод жанчын — Святлана Сянюк). Усе пераможцы атрымалі прызы — спартыўную форму.

*В.Ф. КАВАЛЁЎ,*
*галоўны суддзя спаборніцтваў,*
*старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома супрацоўнікаў БДУ*
*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*



АБ'ЯВЫ

# Запрашаем на выставу

Фундаментальная бібліятэка БДУ з 25 кастрычніка па 15 лістапада ў бібліятэцы хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) ладзіць выставу "Навуковыя працы першага загадчыка кафедры аналітычнай хіміі БДУ Мікалая Фёдаравіча Ярмоленкі", прымеркаваную да 70-годдзя ўтварэння кафедры аналітычнай хіміі.

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-НАВУЧАЛЬНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ БДУ**

*аб'яўляе конкурс*
на замяшчэнне вакантнай пасады
старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі квантавай тэорыі поля (1 чал.).

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220040, г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 153, аддзел кадраў, тэл. 232-60-34.**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# Каменная казка

Традыцыйная Міжнародная мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка", прысвечаная 70-годдзю з дня заснавання геаграфічнага факультэта БДУ, адбылася 3—7 лістапада. Падчас адкрыцця выставы быў наладжаны канцэрт дзіцячага танцавальнага ансамбля БДУ "Літарынка". Падчас працы "Каменнай казкі" ахвотныя маглі пазнаёміцца з фотавыставамі "Таямніцы падземнага царства", "Даліна прывідаў", "Парк юрскага перыяду". Дэманстраваліся таксама відэагазета "Гісторыя геаграфічнага факультэта ў асобах" і відэафільм "Наш музей".

У зале Музея землязнаўства на геаграфічным факультэце таксама дзейнічалі выставы "Палеанталагічнае лета — 2004", "Мары прафесара збыліся", "Стратыграфія РБ" і выстава разьбы выкладчыка кафедры дынамічнай геалогіі Данілы Твaraновіча-Сеўрука.

*Іван ФЕДАРОВІЧ*

# Маскоўскі канцэптуаліст на філфаку БДУ

11—13 кастрычніка Мінск на запрашэнне дэканата філалагічнага факультэта наведаў вядомы рускі паэт з Масквы Усевалад Някрасаў — прадстаўнік ліянозаўскай групы, адзін з заснавальнікаў "маскоўскага канцэптуалізму". Сустрэча студэнтаў філфака з паэтам адбылася 12 кастрычніка. Някрасаў чытаў свае вершы, з задавальненнем адказваў на пытанні. Для яго важным кампанентам з'яўляецца графічная арганізацыя твораў і размяшчэнне іх на аркушы паперы, але гэта ўсё ж не можа замяніць жывую інтанацыю паэта. Пасля выступу кожны мог набыць кнігі Усевалада Някрасава "Жыву бачу", "Ліянозава", "Даведка", "Пакет" і атрымаць аўтограф.

У культурную праграму маскоўскага госця, які ўпершыню быў у Мінску, арганізатары ўключылі наведванне музеяў Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, старабеларускай культуры, парка камянёў, сустрэчу з маладымі паэтамі.

*Дар'я НОВІКАВА,*
*аспірантка кафедры рускай літаратуры*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Распрацоўкі БДУ ў Шанхаі

*Навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ была шырока прадстаўлена ў нацыянальнай экспазіцыі нашай краіны на Міжнародным прамысловым кірмашы ў Шанхаі (Кітай), што адбыўся 3—9 лістапада.*

Распрацоўкі БДУ дэманстраваліся ў чатырох тэматычных раздзелах: "Мікрахвалевыя тэхналогіі і ЗВЧ-тэхніка", "Экалогія і энергазберагальныя рэсурсы", "Медыцына і фармакалогія", "Новыя прамысловыя тэхналогіі". Экспанатамі сталі прылады для мікрахвалевай сушкі драўніны, стэрылізацыі, апрацоўкі семя гароднінавых культур, аўтацыстэрны і аўтазапраўшчыкі для перавозкі нафтапрадуктаў, спірту, вінапрадуктаў і вады, рэзервуары для падземнага захоўвання нафтапрадуктаў, высокаэфектыўныя фільтры для ачысткі вады, сарбенты для збору разліваў нафты, саставы для засцярогі ад пажараў і гашэння агню, тэст-сістэмы для вызначэння наркатычных і псіхатропных сродкаў, супрацьпухлінныя прэпараты, біялагічна актыўныя дабаўкі, праявіцелі адбіткаў пальцаў для правядзення крыміналістычнай экспертызы.

Некаторыя распрацоўкі навукоўцаў — ноў-хаў, якія па сваёй эфектыўнасці апраджваюць іншыя навінкі падобнага прызначэння. Адзін з прыкладаў — апарат для лазернай хірургіі, сканструяваны спецыялістамі НДІ прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

ЮБІЛЕІ

# “Я ганаруся тым, што захаваў універсітэт...”

## Рэктар Парфен Пятровіч Савіцкі



Трэці сын у сялянскай сям'і Пятра Савіцкага, якога назвалі Парфенам, убачыў свет 28 кастрычніка 1904 г. у мястэчку Гайшын Прапойскай воласці, Быхаўскага павета, Магілёўскай губерні (суч. Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці). Маці памерла рана, і на плечы бацькі лёг увесь клопат аб дзецях. Сваёй зямлі не было, і бацька звычайна працаваў на лесараспрацоўках і лесасплаве.

Парфен з 8 гадоў пачаў наведваць Гайшынскую земскую школу. У 1916 г. паступіў у Прапойскае вышэйшае пачатковае вучылішча, якое скончыў у 1920 г. Працаваў на будоўлях. У 1922 г. ён уступіў у шэрагі ЛКСМБ. У ліпені 1927 г. П.П.Савіцкі быў прыняты Прапойскай раённай арганізацыяй у сябры ВКП(б). У 1929 г. П. Савіцкі быў абраны адказным сакратаром Прапойскага райвыканкама. У 1932 г. ён атрымаў накіраванне на вучобу ў Камуністычны універсітэт Беларусі імя У.І. Леніна на прапагандысцкае аддзяленне. Гэтая вышэйшая партыйная навучальная ўстанова рыхтавала кіруючыя кадры партыйных і савецкіх работнікаў. У верасні 1932 г. яна была рэарганізавана ў Камуністычны інстытут журналістыкі і Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу.

*Многія памятаюць яго клопат пра студэнтаў — былых франтавікоў. Калі ва універсітэт прыйшла дапамога АРА з ЗША, рэктар загадаў скласці ўсё ў пакой, зачыніў яго, заявіўшы, што пакуль ён не апране студэнтаў-выпускнікоў, нікому ніводнай рэчы не дасць. І кіраваў раздачай сам — кожны атрымліваў па дзве рэчы ці адну вельмі добрую.*

Парфен Савіцкі засвойваў веды добра і быў пакінуты на выкладчыцкую працу на кафедры ленінізму і гісторыі партыі. У канцы 1935 г. П.П. Савіцкі быў накіраваны на завочную вучобу ў Інстытут Чырвонай прафесуры. З лістапада 1936 г. паводле рашэння Менскага гаркама КП(б)Б і ЦК ЦП(б)Б ён узначальвае аддзел школ гаркама КП(б)Б. У 1937 г. пленумам Менскага гаркама КП(б)Б ён быў абраны другім сакратаром гаркама партыі.

Спрыялі хуткай партыйнай кар'еры П.П. Савіцкага розныя акалічнасці. Спачатку — арганізаваная ў БССР палітыка “каранізацыі” партыйных органаў. У 1930-я гг. у краіне разгарнулася барацьба з рознымі “ўхіламі” ў ВКП(б), “трацкістамі”, “нацдэмаўшчынай” і г.д. На вызваленых пасадах у партыйных і выканаўчых органах новыя людзі змянялі арыштаваных папярэднікаў, каб пасля знікнуць самім. Сам П.П. Савіцкі быў шчырым камуністам, верыў у камуністычную ідэю і працаваў не для кар'еры. У тым ён быў сапраўдным сынам свайго часу. Гэта аднак не замінала П.П.Савіцкаму быць уважлівым да людзей. Незалежна ад таго, дзе б ён ні працаваў, у якім бы настроі ні быў, калі да яго звярталіся — хоць прыбіральшчыца ці кіроўца, — ён для ўсіх знаходзіў час пагаварыць, выслухаць. Па характары добры і сумленны, ён не мог хлусіць ні ў дробязях, ні ў буйным.

БДУ тым часам скаланалі тыя ж падзеі, што і ўсю краіну. 16 ліпеня 1938 г. быў арыштаваны рэктар У.С. Бабраўніцкі, і БДУ ў чарговы раз застаўся без кіраўніка. Арышты не спынілі дзейнасці універсітэта: механізм БДУ працягваў працаваць. Аднак атмасфера варожасці, падазронасці, недаверу падрывалі ўвесь навучальны, навуковы працэс. Назіралася падзенне дысцыпліны. 1087 студэнтаў (амаль увесь БДУ) рэгулярна прапускалі заняткі, 12 кафедраў не мелі ніводнага прафесара, 30 аспірантаў — навуковых кіраўнікоў. У бібліятэцы БДУ не было неабходных падручнікаў. Вінаватымі ў гэтых бедах абвяшчаліся “ворагі народа”.

13 снежня 1938 г. рэктарам БДУ быў прызначаны Парфен Пятровіч Савіцкі. Відаць, у ЦК КП(б)Б вырашылі, што пасаду рэктара неабходна аддаць партыйнаму работніку, які б не меў “плям” у біяграфіі. Немалую ролю пры прызначэнні, мусіць, адыграла тое, што Парфен Пятровіч лічыўся добра адукаваным па тых часах чалавекам, каб узначаліць універсітэт.

П.П. Савіцкі прыняў універсітэт у складзе 5 факультэтаў (біялагічнага, геаграфічнага, гістарычнага, фізіка-матэматычнага, хімічнага). У БДУ вучылася 1249 студэнтаў і 52 аспіранты. Навучальны працэс вялі 118 навукоўцаў: 16 прафесараў, 57 дацэнтаў і старшых выкладчыкаў, 45 асістэнтаў і выкладчыкаў. Бюджэт універсітэта складаў 4,6 млн. рублёў.

Перад новым рэктарам паўсталі задачы па нармалізацыі работы універсітэта. Важна было вырашыць праблему з навучальнымі і інтэрнацкімі плошчамі. У біялагічным корпусе размяшчаліся біяфак, гістфак, рабфак, уся адміністрацыя, бібліятэка, студэнцкія арганізацыі. Там жа некалькі аўдыторый былі заняты пад інтэрнат. Студэнты гістфака займаліся ў хімічных лабараторыях і заалагічным музеі. Ва універсітэцкім гарадку, збудаваным адмыслова для БДУ, у той час размяшчаліся інстытуты — педагагічны, медыцынскі, політэхнічны, народнай гаспадаркі. Сам БДУ займаў тры карпусы.

Перад рэктарам стаяла і праблема нармалізацыі атмасферы ў калектыве БДУ, спустошаным палітычнымі рэпрэсіямі. Калі Савіцкі стаў рэктарам, то ў першыя дні сустрэў пэўнае супрацьдзеянне. Ён не меў навуковай ступені і для навукоўцаў быў чалавекам малавядомым. Шмат каго ў БДУ рэпрэсавалі, і ўжо адно тое, што Савіцкі прыйшоў з партыйных органаў, насцярожвала. Распавядаюць, што вахцёрка пры ўваходзе ў корпус, дзе месцілася адміністрацыя, на працягу доўгага часу кожны раз патрабавала ў яго пропуск. Аднак Парфен Пятровіч не спрабаваў пратэставаць ці сароміць. Ён моўчкі даставаў пасведчанне і працягваў жанчыне. Ён імкнуўся не звяртаць увагі на дэманстратыўную няўважлівасць да яго, разумеючы, што пераламіць гэта можна толькі ўласным аўтарытэтам.

Парфен Пятровіч не быў буйным навукоўцам, але і не выкарыстоўваў сваю пасаду для атрымання навуковых ступеняў. Затое ён выявіў сябе здольным адміністратарам. Так было ў выпадку з філалагічным факультэтам. Увесну 1939 г. пачалася работа па яго арганізацыі. Памяшканняў, аднак, выдзелена не было. Дапамог выпадак. У чэрвені 1939 г. выйшлі пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб ліквідацыі рабочых факультэтаў. Рэктар дабіўся, каб навучальныя плошчы (9 вучэбных аўдыторый і 178 інтэрнацкіх месцаў) цалкам перадаваліся БДУ. Клопат Парфена Пятровіча аб універсітэце праяўляўся як у вялікім, так і ў малым — напрыклад, адкрыцці кніжнага кіёска, аб чым неаднаразова прасілі студэнты і супрацоўнікі. Але рэктар фармалізму не цярпеў і сродкі не марнаваў. Так, 10 мая 1940 г. быў распушчаны з-за дрэннай працы і нявыхад на заняткі і дэманстрацыю духавы аркестр. 20 чэрвеня з тых жа прычынаў — пункт матацыклетнай вучобы.

У 1939/1940 навучальным годзе бюджэт БДУ склаў 5 млн 762 тыс.руб. Павелічэнне бюджэту дазволіла абнавіць вучэбнае і навуковае абсталяванне, пачаць выпуск навуковага часопіса “Вучоныя запіскі БДУ”. Значнай падзеяй стала адкрыццё 10 лютага 1940 г. гісторыка-археалагічнага музея.

У рэдкія вольныя гадзіны рэктар цалкам аддаваўся захапленню — прыродзе. Менавіта з яго рукі быў пашыраны і палепшаны батанічны сад у двары універсітэта, у біялагічным корпусе была створана аранжарэя, дзе раслі экзатычныя кветкі і расліны. А ў сваім кабінеце паміж шыбамі акна Парфен Пятровіч трымаў вулей.

У чэрвені 1941 г. БДУ рыхтаваўся азначыць сваё 20-годдзе. Тут працавалі 6 факультэтаў (біялагічны, геаграфічны, гістарычны, фізіка-матэматычны, філалагічны, хімічны) і 33 кафедры. У БДУ вучылася 1337 студэнтаў і 69 аспірантаў. Педагагічнай і навуковай працай займаліся 17 прафесараў, 41 дацэнт, 42 старшыя выкладчыкі, 28 выкладчыкаў, 23 асістэнты.

З ініцыятывы П.П. Савіцкага 7 сакавіка 1941 г. быў скліканы Вучоны Савет БДУ, на якім абмяркоўвалася пытанне пераводу выкладання на беларускую мову. Рэктар адзначыў, што ніякага апраўдання не можа быць таму, што апошнія два гады ўсё справаводства БДУ і грамадскіх арганізацый вялося па-руску. Савет пастанавіў перавесці на беларускую мову справаводства, грамадскую работу, насценгазеты і ў наступным навучальным годзе пачаць выкладанне часткі дысцыплін па-беларуску.

На 24—28 чэрвеня 1941 г. было прызначана святкаванне 20-гадовага юбілею БДУ. Але пачалася вайна. Ужо 22 чэрвеня тыя студэнты і выкладчыкі, што падлягалі прызыву, з'явіліся ў ваенкаматы — іх было каля 450 чалавек. З раніцы 24 чэрвеня Мінск стаў падвяргацца масіраваным бамбардзіроўкам, узнікла паніка, спынілі работу прадпрыемствы, пачаўся зыход насельніцтва. П.П.Савіцкі здолеў знайсці грузавік, на якім вырашылі вывезці бацькоў, жонак, дзяцей супрацоўнікаў універсітэта. У Магілёве П.П. Савіцкі дзякуючы пасведчанню дэпутата Вярхоўнага Савета БССР здолеў пагрузіць групу на цягнік, і яны даехалі да Масквы.

*А ў сваім кабінеце паміж шыбамі акна Парфен Пятровіч трымаў вулей.*

У армію П.П. Савіцкага не бралі з прычыны цяжкай хваробы, і неўзабаве ён атрымаў прызначэнне ў Ніжні Тагіл (Свярдлоўская вобласць Расіі) дырэктарам педагагічнага інстытута. Падчас працы ў Ніжнім Тагіле П.П. Савіцкі шукаў выкладчыкаў БДУ, раскіданых у эвакуацыі, і падтрымліваў з імі сувязь. Гэта дапамагло пры аднаўленні універсітэта.

2 чэрвеня 1942 г. Бюро ЦК КП(б)Б абмеркавала пытанне аб аднаўленні дзейнасці БДУ ў складзе трох факультэтаў — філалагічнага, гістарычнага і геаграфічнага. У студзені 1943 г. СНК БССР звярнуўся да СНК СССР з хадайніцтвам аб аднаўленні БДУ ўжо ў час вайны. Гэта матывавалася тым, што для аднаўлення гаспадаркі і культуры БССР будзе вялікая патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах, а ў час вайны БДУ сканцэнтруе хаця б асноўную групу навукоўцаў Беларусі.

Пытання з прызначэннем рэктара не ўзнікала: 16 лютага 1943 г. ім быў прызначаны П.П. Савіцкі. 15 мая 1943 г. СНК СССР прымае пастанову “Аб аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта”. Месцам яго дзейнасці была прызначана станцыя Сходня Кастрычніцкай чыгункі пад Масквою. У гэтых цяжкіх умовах ізноў выявіўся выдатны арганізатарскі талент П.П. Савіцкага. Ён стаў выклікаць у Маскву ўсіх беларускіх выкладчыкаў. Праз Беларускі штаб партызанскага руху, што размяшчаўся тут жа, на Сходні, П.П.Савіцкі здолеў дастаць студэнтам і выкладчыкам ватнікі, валёнкі, коўдры, падушкі і іншыя рэчы.

Заняткі пачаліся 11 кастрычніка 1943 г. Спачатку ў БДУ вучылася 289 студэнтаў, але камплектацыя працягвалася і пазней: у снежні было каля 500 чалавек. Заняткі вялі 40 выкладчыкаў. У студзені 1944 г. прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта налічваў ужо 65 чалавек, у т.л. 4 акадэмікі, 18 прафесараў і 24 дацэнты.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў першая група студэнтаў (26 чалавек) на чале з рэктарам прыбыла ў Мінск 11 жніўня 1944 г. Універсітэт выглядаў сумна. Яшчэ ў 1941 г. салдаты вермахта разрабавалі і панішчылі абсталяванне лабараторый і кабінетаў, бібліятэкі і музеяў. З карпусоў у прымальным стане застаўся толькі фізіка-матэматычны.

У верасні прыбыў эшалон з работнікамі і студэнтамі універсітэта. У мінімальна абсталяваных памяшканнях размяшчаліся службы і аўдыторыі універсітэта. Заняткі ішлі ў дзве-тры змены. Асабліва цяжкай была зіма 1944/1945 гг.: стаяў такі холад, што замярзалі чарнільніцы-непралівайкі, студэнты таемна ламалі сталы, каб здабыць хоць крыху паліва для печак. Але універсітэт працаваў. Важнай падзеяй, што сведчыла аб адраджэнні універсітэта, стала навуковая сесія БДУ 19—23 траўня 1945 г., якая прысвячалася аднаўленню работы БДУ і ўдзелу яго ў адбудове народнай гаспадаркі і культуры Беларусі. У жніўні 1945 г. адбыўся першы пасляваенны набор студэнтаў — 420 чалавек.

У гэты перыяд Парфен Пятровіч нястомна працаваў. Многія памятаюць яго клопат пра студэнтаў — былых франтавікоў. Калі ва універсітэт прыйшла дапамога АРА з ЗША, рэктар загадаў скласці ўсё ў пакой, зачыніў яго, заявіўшы, што пакуль ён не апране студэнтаў-выпускнікоў, нікому ніводнай рэчы не дасць. І кіраваў раздачай сам — кожны атрымліваў па дзве рэчы ці адну вельмі добрую.

У 1946 г. П.П.Савіцкі падаў заяву ў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) у Маскве для вучобы і напісання дысертацыі. 12 снежня 1946 г. Парфен Пятровіч пакінуў пасаду рэктара БДУ, на якой працаваў амаль 8 гадоў. У Маскве ён вучыўся толькі год і ў сакавіку 1948 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме “Акупацыйны рэжым нямецкіх захопнікаў у Беларусі”.

У 1948 г. П.П.Савіцкі вяртаецца ў Мінск і працуе загадчыкам кафедры марксізму-ленінізму Беларускага політэхнічнага інстытута. У 1949 г. яго прымаюць на палову стаўкі як сумяшчальніка на такую ж кафедру ў БДУ. 1 сакавіка 1949 г. П.П.Савіцкі быў узнагароджаны ордэнам “Знак Пашаны”, які дадаўся да медаля “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг”. Былі адзначаны заслугі Парфена Пятровіча і перад універсітэтам: 30 кастрычніка 1951 г. ён атрымаў Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР за поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных навукова-педагагічных кадраў, развіццё навукі і культуры Беларусі.

Аднак здароўе Парфена Пятровіча пагаршалася, абвастраліся даўнія хваробы, давалася ў знакі напружаная праца. 15 кастрычніка 1952 г. здарыўся інсульт. Ён пакідае працу на кафедры БДУ. 8 жніўня 1954 г. ён згубіў прытомнасць і, не прыходзячы ў сябе, 11 жніўня памёр. Пахаваны Парфен Пятровіч Савіцкі рашэннем ЦК КПБ на Вайсковых могілках у Мінску.

Парфен Пятровіч вельмі любіў сваіх дзяцей: Барыса, Вольгу, Святлану, і універсітэт лічыў за сваё дзіця. БДУ значыў для яго вельмі шмат. Прадчуваючы, што доўга жыць не будзе, аднойчы ён сказаў, што сваю місію на гэтым свеце ён выканаў: захаваў універсітэт, і вельмі гэтым ганарыцца.

*А.Г. ЗЕЛЬСКІ,*
*кандыдат гістарычных навук*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Неабходны дапаможнік

*“Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта”: Сістэматычны паказальнік артыкулаў (1969—1999): Сацыяльныя і гуманітарныя навукі/ Склад.: Л.С.Бункевіч, Т.І.Міцюхіна. — Мн., БДУ. 2003.*

Беларускі дзяржаўны універсітэт па-ранейшаму займае лідэрскія пазіцыі ў навукова-навучальным свеце нават у рэаліях новага часу, калі з'явіліся дзесяткі новых дзяржаўных і прыватных акадэмій, універсітэтаў, каледжаў і іншых навучальных установ. Каб канчаткова пераканацца ў гэтым, дастаткова паглядзець, які творчы багаж маюць выкладчыкі БДУ, супрацоўнікі даследчых установ, аспіранты, магістранты і студэнты. Тут прыйдзе на дапамогу бібліяграфічны сістэматычны паказальнік зместу часопіса “Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта” за 30 гадоў існавання перыёдыка.

Рэспубліканскі навукова-тэарэтычны часопіс “Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта” выдаецца з 1969 г. у чатырох серыях, па тры нумары за год у кожнай: I. Фізіка, матэматыка, механіка; II. Хімія, біялогія, геаграфія; III. Гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права; IV. Філасофія, журналістыка, педагогіка. Часопіс асвятляе дасягненні беларускіх навукоўцаў у галіне фундаментальных, прыкладных, грамадскіх і гуманітарных навук, пытанні развіцця іх творчых сувязяў з замежнымі навучальнымі цэнтрамі. Паступае часопіс у навуковыя цэнтры, навучальныя ўстановы, бібліятэкі больш чым 30 краін свету, у тым ліку еўрапейскія, ЗША, Канады, Японіі, Кітая, Індыі, Ізраіля.

У сістэматычны паказальнік уключаны артыкулы толькі з трэцяй і чацвёртай серый часопіса — гэта значыць, па сацыяльных і гуманітарных навуках, апублікаваныя ў 1969—1999 гг.

Аналіз рэтраспектыўных паказальнікаў зместу часопісаў мае два галоўныя крытэрыі, якія трэба найперш браць пад увагу: а) агульнанавуковая значнасць — наколькі змешчаныя ў паказальніку матэрыялы дазваляюць зрабіць ацэнку стану пэўнай навуковай галіны (і тут ад укладальнікаў мала што залежыць); б) методыка-бібліяграфічны ўзровень паказальніка — наколькі зручна ім карыстацца пры пошуку неабходнай інфармацыі (тут ад укладальнікаў залежыць амаль усё).

**Валерый Герасімаў:** На старонках паказальніка — і апагей “застою”, і вяртанне нацыянал-дэмакратычнага погляду на гістарычныя рэаліі, і пазнейшыя спробы “аб'ектывісцкага” падыходу ў асэнсаванні і пераасэнсаванні былых падзеяў. Маладзейшае пакаленне даследчыкаў сёння ўвогуле даволі нігілістычна ставіцца да прац папярэднікаў з-за ідэалагізаванасці праблематыкі і кансерватыўнасці метадалогіі. Хоць назбіраная раней фактаграфія стала базай многіх сучасных падыходаў.

**Віталь Скалабан:** Гэта адносіцца не толькі да гісторыкаў, а да прадстаўнікоў і іншых спецыяльнасцяў. Зусім невыпадкова сустрэў у паказальніку прозвішчы гісторыкаў Аляксея Ігнаценкі, Эдуарда Загарульскага, Уладзіміра Івашына, Гілера Ліўшыца, Пятра Брыгадзіна, Льва Шнерсона, філасофаў Аляксея Кляўчэні, Рыгора Трухнова, філолагаў Сцяпана Александровіча, Міхаіла Булахава, Ніла Гілевіча, Адама Супруна, Льва Шакуна, журналістаў Еўфрасінні Бондаравай, Рыгора Булацкага, юрыстаў Анатоля Галаўко, Васіля Чыгіра, Язэпа Юхо...

**В.Г.**: Дапаможнік станецца даволі зручнай крыніцай для інфармацыйных патрэб органаў улады, кіравання і самакіравання краіны. Ён прыйшоўся да часу і таму, што дапаможа ў вырашэнні праблемы, якая хвалюе мяне сёння ў якасці загадчыка сектара старадрукаў і рэдкіх выданняў: як арганічна спалучыць даўнюю прававу літаратуру з найноўшымі тэарэтычнымі напрацоўкамі айчыннай юрыдычнай і іншых сумежных навук? Як зрабіць і тое, і другое карысным і неабходным для паўсядзённай практыкі заканатворчай дзейнасці і дзяржаўнага кіравання?

Звярнуся да некалькіх прыкладаў. У сярэдзіне 90-х для даследчыкаў і практыкаў нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі важнае значэнне мелі публікацыі праграм беларускіх палітычных партый пачатку стагоддзя: Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Хрысціянска-Дэмакратычнай Злучнасці Беларусаў, Беларускай Сацыялістычнай Грамады й іншых, а таксама агульнарасійскіх партый — кадэтаў, акцябрыстаў і г.д. Улічваючы аднаўленне ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь шматпартыйнай палітычнай сістэмы, гістарычны вопыт папярэднікаў тут вельмі прыдасца.

Некаторыя публікацыі сёння не маюць былой актуальнасці —напрыклад, тэма пра “ўзмацненне рэгулюючага ўплыву пярвічных партарганізацый калгасаў і саўгасаў у Беларусі на рост і склад партыйных шэрагаў”. Некаторыя, наадварот, набываюць не зусім звыклую актуальнасць — “прэзідэнцкія выбары 1932 года ў Германіі і пазіцыя прафсаюзаў”. У раздзеле “Філасофскія навукі” мірна суседнічаюць публікацыя з блізкага 1995 г. пра “ідэі гарманізацыі як сацыякультурны імператыў узаемадзеяння чалавека і прыроды” і артыкул з ужо далёкага 1972 г. пра “каталіцкую царкву Аргентыны на службе рэакцыі”. У большасці выпадкаў аўтары прадстаўлены адной-дзвюма працамі, хоць некаторым належыць ад 3 да 10.

Такім чынам, змешчаныя ў паказальніку публікацыі па навукова-метадычным узроўні, тэматычнай разнастайнасці і глыбіні раскрыцця праблем аб'ектыўна і дастаткова поўна характарызуюць інтэлектуальны стан беларускага грамадства ў разглядаемае 30-годдзе. Тым больш своечасовым і неабходным выглядае звядзенне і сістэматызацыя ўсёй гэтай значнай дакументальнай плыні пад вокладкаю аднаго выдання.

**В.С.**: Шкада, што за апошнія гады гэта ці не адзіны выпадак складання рэтраспектыўнага паказальніка зместу часопіса. А добра было б, каб нехта падхапіў гэтую добрую ініцыятыву і зрабіў аналагічныя дапаможнікі па часопісе “Наш край”, літаратурна-мастацкіх часопісах “Полымя”, “Узвышша”, “Маладняк”. Дый сучасныя перыёдыкі “Архівы і справаводства”, “Беларуская мінуўшчына” не маюць зместу друкаваных матэрыялаў нават за год.

**В.Г.**: Ці зручна зроблены паказальнік для пошуку неабходных крыніц? На першы погляд, усё як мае быць: бібліяграфічныя запісы складзены згодна з правіламі, арыентавацца ў іх масіве няцяжка. У прадмове звяртаецца ўвага на электронны варыянт паказальніка, што знаходзіцца ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ.

**В.С.**: Што да структуры паказальніка, яна лагічная і дакладная. Асабліва хачу падкрэсліць каштоўнасць апошніх раздзелаў —“Імёны ў гісторыі універсітэта”, “Нашы юбіляры”, “Памяці вучонага”, “Да юбілейных дат БДУ”. Шкада, што не ўключаны раздзел рэцэнзій: яны важны індыкатар навуковай значнасці і грамадскай запатрабаванасці тых або іншых распрацовак.

**В.Г.**: А пра дапаможны імянны паказальнік што можна сказаць?

**В.С.**: Без яго, зразумела, як без рук. Адно што некаторыя пазіцыі ўсё ж маюць недакладнасці. Рубрыка “Колас Я.” (С. 220) змешчана памылкова, таму што адлюстраваныя ў ёй нумары належаць бібліяграфічным апісанням, у якіх прозвішча народнага пісьменніка фігуруе толькі ў варыянце “Колас Я.”.

Рубрыкі з варыянтамі прозвішча і ініцыялаў на беларускай і рускай мовах можна было б забяспечыць адсылкамі. Інакш гэта блытае карыстальніка: адна і тая самая канкрэтная асоба ці дзве розныя? Напрыклад, пары прозвішчаў “Брусаў В.” і “Брюсов В.”, “Булацкі Р.В.” і “Булацкий Г.В.”,“Куляшоў Ф.І.” і “Кулешов Ф.И.” ды інш.

**В.Г.**: Дадам таксама, што ні ў выхадных звестках, ні ў прадмове не пазначана, на базе якой установы падрыхтаваны паказальнік. З прадмовы выглядае, што ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ. Але ці так гэта?

У цэлым, як бачыцца, сістэматычны паказальнік носіць навукова-дапаможны характар і можа з поспехам выкарыстоўвацца ў навукова-даследчай і вучэбнай рабоце. Застаецца падзякаваць складальнікам Лізавеце Бункевіч і Тацяне Міцюхінай і выдаўцам БДУ за такую неабходную бібліяграфічную працу і спадзявацца на яе чарговы выпуск-працяг.

*Віталь СКАЛАБАН,*
*Валерый ГЕРАСІМАЎ*

## АБ'ЯВЫ

### “ВЕСНІК БДУ”

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2005 года. Падпісная цана на часопіс “Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта” па серыях наступная:

**Серыя I** — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№1, студзень; № 2, май): індывідуальная (індэкс 74851) — 13.510 р.; ведамасная (індэкс 748512) — 28.409 р.

**Серыя II** — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень): індывідуальная (індэкс 74852) — 13.510 р.; ведамасная (індэкс 748522) — 28.409 р.

**Серыя III** — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік): індывідуальная (індэкс 74853) — 6760 р.; ведамасная (індэкс 748532) — 14.204 р.

**Серыя IV** — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік): індывідуальная (індэкс 74854) — 6760 р.; ведамасная (індэкс 748542) — 14.204 р.

Падпісацца на часопіс “Веснік БДУ” можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса*

# Выдадзена ў БДУ

*За тры кварталы бягучага года выдадзена 147 кніг і брашур агульным аб'ёмам 1137,02 улікова-выдавецкага аркуша. Таксама падрыхтаваны да друку 103 арыгінал-макеты (934,38 ул.-выд. арк). Па прадастаўленні рукапісаў добра спрацавалі агульнауніверсітэцкія кафедры: англійскай мовы і моўнай камунікацыі, нямецкай мовы, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, медыка-біялагічных тэхналогій, — а таксама факультэты: ваенны, гістарычны, радыёфізікі і электронікі, біялагічны, юрыдычны, эканамічны.*

***В.И. Стражев.* Образование и наука в современном обществе.** У кнізе разглядаюцца сусветныя тэндэнцыі ў галіне адукацыі, вопыт развіцця савецкай і беларускай постсавецкай вышэйшай і сярэдняй школы, пытанні ідэалогіі і выхавання ў жыцці грамадства. У папулярнай форме абмяркоўваецца шэраг праблем сучаснай тэарэтычнай фізікі. Падаюцца матэрыялы, арыентаваныя на выкладчыкаў і студэнтаў фізіка-матэматычных спецыяльнасцей універсітэтаў.




***В.И. Стражев.* Неподведение итогов.** У выданні змешчаны артыкулы аб праблемах і перспектывах развіцця адукацыі ў сучасным грамадстве, аб навуковым і творчым шляху аўтара. Ёсць таксама храналагічны паказальнік публікацый.

**Э.М. Загорульский. Вищинский замок XII-XIII вв.** Кніга распавядае пра унікальны гістарычны помнік на тэрыторыі Беларусі — баярскі палац-замак XII—XIII стст., раскопкі якога вяліся на працягу 10 гадоў археалагічнай экспедыцыяй БДУ. Асобная глава прысвячаецца знойдзенаму на месцы раскопак скарбу сярэбраных грашовых злiткаў і ўпрыгожанняў — шэдэўраў старажытнага ювелірнага майстэрства.




***Л.В. Жук.* Система управления базами данных Microsoft Access.** Практыкум па раздзеле “Базы даных” курсаў “Асновы інфарматыкі і інфармацыйныя тэхналогіі”, “Інфарматыка і праграміраванне”, “Інфарматыка” для персанальных камп'ютараў. Даюцца метадычныя ўказанні па вывучэнні сістэмы кіравання базамі даных Microsoft Access, алгарытмы рашэння прыкладаў і заданні для кантрольных і індывідуальных работ.

**О.Н. Здрок. Гражданский процесс зарубежных стран.** У курсе лекцый аналізуюцца прынцыпы і асаблівасці грамадзянскага працэсу за мяжой, стан і перспектывы развіцця асноўных працэсуальных інстытутаў. Прызначаецца для студэнтаў спецыяльнасцей “Правазнаўства” і “Міжнароднае права”, аспірантаў, выкладчыкаў.

***А.В. Сидоренко.* Физика.** Выкладаюцца асноўныя раздзелы фізікі: механіка, малекулярная фізіка, электрычнасць і магнетызм, оптыка, атамная і ядзерная фізіка. Комплексны падыход у выкладанні матэрыялу дазваляе ў лаканічнай форме падаць асноўныя фізічныя з'явы і законы, прывесці прыклады іх праяўлення і выкарыстання ў біялагічных сістэмах.

***Л.В. Козловская.* Социально-экономическая география Беларуси.** У другой частцы курса лекцый “Сацыяльна-эканамічная геаграфія Беларусі” даецца эканоміка-геаграфічная характарыстыка міжгаліновых комплексаў Беларусі: паліўна-энергетычнага, металурга-машынабудаўнічага, хімічнага, лесапрамысловага, будаўнічапрамысловага, па вытворчасці тавараў народнага спажывання, аграпрамысловага, інфраструктурнага, а таксама знешнеэканамічных сувязей краіны.

***Ю.И. Воротницкий.* Сборник задач по курсу “Программирование”.** Зборнік адрасуецца студэнтам, якія вывучаюць базавы курс праграміравання. Па кожнай тэме прапануецца 12 варыянтаў заданняў, што дазваляе арганізаваць індывідуальную працу студэнтаў акадэмічнай групы. Зборнік складзены з улікам вопыту выкладання праграміравання на факультэце радыёфізікі і электронікі БДУ.




***М.К. Буза, Л.В. Певзнер, В.Ю. Сакович.* Работа в Интернете.** У выданні разглядаюцца пытанні працы ў камп'ютарнай сетцы: падключэнне, электронная пошта, адрасная кніга, пошук тэматычнай інфармацыі ды інш. Прызначаецца студэнтам гуманітарных факультэтаў БДУ.

*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*11 лістапада 2004 года*
*Падпісана да друку 09.11.2004 г.*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 1035. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў РУП “Выдавецкі цэнтр БДУ” 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

Рэдактар Тацццяна КАЗАК

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by www.gazeta.bsu.by*